# Першая вышэйшая медыцынская адукацыйная ўстанова на тэрыторыі Беларусі

***Чымбур Кацярына Валер'еўна, Ціцянкова Вольга Уладзіміраўна***
*Белорусский государственный медицинский университет, Мінск*
***Научный(-е) руководитель(-и) Ратынская Наталля Валяр'янаўна** , Белорусский государственный медицинский университет, Мінск*

**Введение**

Кожны чалавек, якога можна лічыць адукаваным, павінен ведаць гісторыю той установы, у якой ён атрымаў прафесію. Вытокі ж нашай і знаходзяцца ў Гародні, дзе ўпершыню Жан Эмануэль Жылібер пачаў вучыць медыцынскай справе беларусаў. На жаль, гісторыю гэтай установы мы ведаем павярхоўна. Таму актуальнасць дадзенай тэмы, на наш позірк, відавочная, бо немагчыма рухацца наперад, калі пра сваё мінулае ты не ведаешь.

**Цель исследования**

Больш падрабязна падаць інфармацыю аб заснаванні і развіцці Гродзенскай медыцынскай акалэміі ад пачатку яе дзейнасці і да канца.

**Материалы и методы**

Матэрыяламі для нашага даследавання з'яўляліся перыядычныя выданні і кнгі з бібліятэк, матэрыялы сеткі Інтэрнэт, вынікі апытання навучэнцаў БДМУ.

**Вынікі**

Дзякуючы праведзенаму апытанню, мы высветлілі не толькі сярэднюю дасведчанасць студэнтаў аб гісторыі з'яўлення прафесіі медыка на Беларусі, Гродзенскай медыцынскай акадэміі, але і іх гатоўнасць пашырыць свае веды ў гэтай вобласці пры наяўнасці цікавых фактаў і даступных звестак. Што тычыцца самога даследвання, то яшчэ раз пацвердзілася, што Гродзенская медыцынская акадэмія - гэта не толькі першая ўстанова, з якой выходзілі найадукаванейшыя людзі, гатовыя быць ганаровым служачым медыцыны. Гэта яшчэ і фундамент, дзякуючы якому такіх людзей стала ў разы больш з заснаваннем адпаведнай кафедры ў Віленскім універсітэце. Гэта навуковыя даследаванні, вынікамі якіх мы карыстаемся да гэтых пор. Гэта змены не толькі ў вобласці медыцыны, а і ў сацыяльным становішчы краіны таго часу, калі вышэйшая адукацыя стала даступнай для сялян. Гэта крок наперад, які быў зроблены ў васемнаццатым стагоддзі. Таму не будзе лішнім, акрамя анатоміі і артапедыі, хоць крыху ведаць гісторыю сваёй прафесіі і ўстановы, каб не быць невукам сёння.

**Вывады**

Прагрэс медыцыны - гэта цяжкі шлях, на якім сустракаюцца як перамогі, так і паражэнні. Але яшчэ складней гэты шлях пачаць,і менавіта таму нам неабходна разумець і ўсведамляць усю значнасць дзейнасці Жылібера і яго найлепшага тварэння - Медыцынскай акадэміі - не толькі для развіцця навукі, але і для ўсяго беларускага народа.